# БЕЛАРУСЬ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ПАЧАТКУ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: ДАКУМЕНТАЛЬНЫ НАРАТЫЎ І ДАСЛЕДЧЫЦКІЯ ПАДЫХОДЫ

**В. М. Бароўская**

## УПЛЫЎ "ПАКТА ЧАТЫРОХ" 1933 г. НА РАЗВІЦЦЁ САВЕЦКА-ПОЛЬСКІХ АДНОСІН 1933–1939 гг.

У пачатку 1930-х гадоў у савецкай знешняй палітыцы зноў адбыўся паварот у бок збліжэння з краінамі Версальскай сістэмы. Пачалася планамерная падрыхтоўка да заключэння "Дагавора аб ненападзенні" з Польшчай. Яшчэ ў ноце ад 29 снежня 1928 г. часова выконваючага абавязкі народнага камісара замежных спраў СССР М. М. Літвінава пасланніку Польшчы ў Маскве С. Патэку была выказана прапанова падпісаць пратакол аб датэрміновым увядзенні ў дзеянне пакта Келага–Брыяна паміж Польшчай і СССР [1, с. 45–47]. На пасяджэнні Палітбюро ЦК УКП (б) 25 студзеня 1930 г. абмяркоўвалася пытанне паляпшэння савецка-польскіх адносін, было вырашана ўказаць паўнамоцнаму прадстаўніку ў Варшаве "будаваць свае адносіны з польскім Міністэрствам замежных спраў, зыходзячы з таго, што ў дадзены момант мы не зацікаўлены ў абвастрэнні адносін з палякамі" [2, с. 55].

Палітычную аснову савецка-польскіх адносін у 1930-х гг. складаў "Дагавор аб ненападзенні", падпісаны 25 ліпеня 1932 г. у Маскве. Па прычыне таго, што ён з'яўляўся адным з некалькіх пактаў такога тыпу, заключаных СССР (у прыватнасці, з Францыяй, Латвіяй, Эстоніяй і Фінляндыяй), яго можна было прызнаць фактарам, які забяспечваў СССР бяспеку яе межаў. Што датычыцца двухбаковых адносін паміж СССР і Польшчай, то з прыходам гітлераўцаў да ўлады ў Германіі і павелічэннем пагрозы вайны стваралася новая палітычная платформа для іх развіцця. Рост напружанасці ў польска-германскіх адносінах быў абумоўлены рэвізіяніцкімі патрабаваннямі А. Гітлера аб далучэнні Гданьскага Памор'я. У Польшчы яны выклікалі абарончую рэакцыю [2, с. 55].

Падпісаны ў 1932 г. "Дагавор аб ненападзенні" паміж СССР і Польшчай, завяршаючы адзін з этапаў савецка-польскіх адносін, мог стаць асновай для іх уздыму на новы і больш высокі ўзровень. Але ён жа мог стаць і найвышэйшай кропкай у іх развіцці. Тая ці іншая яго роля залежыла ад таго, наколькі адпавядаў ён стратэгічным мэтам знешняй палітыкі абедзвюх дзяржаў. Савецкі ўрад, падпісваючы дагавор, як бы заяўляў аб тым, што ў бліжэйшы час не будзе выкарыстоўваць нацыянальны рух у Заходняй Беларусі і Украіне для спроб развалу Польскай дзяржавы, як гэта рабілася раней. З боку Польшчы гэта было сведчаннем таго, што яе актыўная палітыка ў Цэнтральна-Усходняй Еўропе, уздоўж заходніх межаў СССР, не мае на мэце стварэння агрэсіўнага антысавецкага блока.

У 1933–1939 гг. у адносінах паміж СССР і Польшчай узнікаюць праблемы, на развіццё якіх істотны ўплыў аказвалі палітычныя змены ў Еўропе. Савецкі і польскі бакі мелі розныя погляды на многія з гэтых праблем, разыходжанні паглыбляліся адрознасцю грамадскага ладу Польшчы і СССР. Генеральным кірункам савецкай знешняй палітыкі было захаванне міру ў Еўропе і ва ўсім свеце і ліквідацыя пагрозы вайны шляхам стварэння сістэмы калектыўнай бяспекі, аснову якой складалі б шматбаковыя дагаворы, у першую чаргу падмацаваны спецыяльнымі дамовамі пакт Лігі Нацый. Польскі ўрад лічыў, што забяспечыць краіне мір дапаможа захаванне нейтралітэту ў спрэчных міжнародных праблемах, падмацаваны дагаворамі з суседзямі аб ненападзенні і нейтралітэце. У савецка-польскіх адносінах у 1933–1939 гг. перыяды супадзення поглядаў і супрацоўніцтва былі больш кароткімі ў параўнанні з перыядамі рознагалоссяў і канфрантацый.

18 сакавіка 1933 г. у Рыме быў агучаны праект так званага "пакта чатырох". Удзельнічаць у ім павінны былі Вялікабрытанія, Францыя, Італія і Германія, пры гэтым прадугледжвалася, што яны будуць вырашаць канфліктныя пытанні, якія існавалі ці маглі ўзнікнуць у Еўропе. Далейшаму збліжэнню СССР, Польшчы і іншых дзяржаў, якім пагражаў праект "пакта чатырох", садзейнічала савецкая прапанова аб падпісанні канвенцыі аб вызначэнні агрэсара. Яго рэалізацыя прадэманстравала б мірныя адносіны, якія існавалі паміж СССР і яго суседзямі, садзейнічала б умацаванню ўзаемнага даверу, паслабленню напружанасці ў Еўропе, уздзейнічала б на камісію па раззбраенні, каб яна прыняла савецкі праект як універсальны. Савецкая прапанова была перададзена 19 красавіка 1933 г. Ю. Лукасевічу. Праз тыдзень пачаліся перамовы. Адначасова наступіла заўважнае ажыўленне савецка-польскіх кантактаў у розных галінах. 1 мая Ю. Пілсудскі сустракаўся з паўнамоцным прадстаўніком СССР у Польшчы У. А. Антонавым-Аўсеенка. У красавіку–маі адбыўся візіт у СССР галоўнага рэдактара "Газеты польскай". Яго місія мела палітычны характар: ён імкнуўся ўпэўніць сваіх суразмоўцаў у тым, што польскія дзяржаўныя інтарэсы выключаюць магчымасць саюза Польшчы з Германіяй для якіх-небудзь наступальных дзеянняў супраць СССР. У маі Польшчу наведала дэлегацыя Народнага камісарыята знешняга гандлю, у выніку пасля гэтага польская прамысловасць атрымала значныя заказы. Пашыраліся навуковыя і культурныя сувязі. У чэрвені былі заключаны дамовы аб сплаве па памежных рэках і дагавор аб парадку расследвання і вырашэння памежных канфліктаў. У ліпені адбыўся візіт у Польшчу галоўнага рэдактара "Известий" [3, с. 331].

Перамовы па пытанні канвенцыі аб вызначэнні агрэсара скончыліся 3 ліпеня 1933 г. яе падпісаннем. У Варшаве канвенцыю расцэньвалі як дапаўненне двухбаковых дагавораў аб ненападзенні і перш за ўсё абавязак аб аказанні ўзаемнай дапамогі ў выпадку нападзення і аб прымяненні санкцый супраць агрэсара. У той жа час канвенцыя садзейнічала папулярызацыі ў капіталістычных дзяржавах прынцыпаў міралюбівай палітыкі СССР. Заключэнне канвенцыі стварыла вельмі спрыяльную атмасферу ў савецка-

польскіх адносінах, якая захоўвалася да вясны 1934 г. [4, с. 58–59]. Савецкі ўрад надаваў важнае значэнне пазіцыі Польшчы ў адносінах да СССР, так як магчымасць ажыццяўлення далёка ідучых планаў экспансіі Германіі была цесна звязана з геапалітычным становішчам Польшчы і залежыла ад таго, ці зможа Германія падпарадкаваць яе палітычна або шляхам захопу. Пэўнае жаданне Польшчы вясной 1933 г. супрацьдзейнічаць гітлераўскім канцэпцыям, а таксама выхад Германіі з Лігі Нацый, што выклікала з польскага боку сур'ёзныя апасенні, надавалі польскай палітыцы рысы сталыя, а не кан'юнктурныя.

Абвяшчэнне савецкім кіраўніцтвам палітыкі, накіраванай на стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі, зусім не азначала, што яно адмаўляецца ад імкнення дабіцца зменаў у палітычным уладкаванні Усходняй Еўропы, якое было ўсталявана ў рамках Версальскай сістэмы міжнародных адносін, у прыватнасці, уключэння Заходняй Беларусі ў склад СССР. Падпісанне Усходняга пакта ўмацавала б знешнепалітычныя пазіцыі СССР і стварыла б умовы для ажыццяўлення тэрытарыяльных зменаў ва Усходняй Еўропе. Наладжванне адносінаў з Польшчай павінна было зняць супрацьдзеянне з яе боку савецкім намаганням па заключэнні названага дагавора.

У другой палове 1933 г. савецкае кіраўніцтва нанесла жорсткі ўдар па нацыянальным руху ў Заходняй Беларусі, правёўшы рэпрэсіі супраць яго лідараў. Аднак савецкае кіраўніцтва не ўнесла прынцыповых зменаў у сваё стратэгічнае планаванне і працэс падрыхтоўкі кадраў да будучай вайны. Да 1935 г. Польшча ўсё яшчэ разглядалася ў якасці галоўнага праціўніка СССР у вайне на захадзе. 2 красавіка 1934 г. адбылася сустрэча народнага камісара замежных спраў СССР М. М. Літвінава з паслом Польшчы ў СССР Ю. Лукасевічам па пытаннях выпрацоўкі праекта заключнага пратакола і падаўжэння тэрміну дзеяння "Дагавора аб ненападзенні". У выніку ён быў падоўжаны да 1945 г.

У 1934 г. была зроблена заява Польшчы аб дэнансацыі Малага Версальскага дагавора аб абароне правоў нацыянальных меншасцяў на яе тэрыторыі. Менавіта ў гэты ж час СССР быў прыняты ў склад Лігі Нацый. У шэрагах польскага кіраўніцтва ўзніклі апасенні, што гэта можа выклікаць актуалізацыю на міжнароднай арэне пытання аб правах нацыянальных меншасцяў на тэрыторыі Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Аднак савецкі бок ніякім чынам не адрэгаваў на факт адмовы Польшчы выконваць вышэй названы дагавор, што яшчэ раз пацвярджае імкненне СССР да нармалізацыі савецка-польскіх адносін. Толькі была выдадзена адозва ЦК КПЗБ "Да працоўных Заходняй Беларусі" ў сувязі з адмовай польскага ўрада ад міжнароднага дагавора аб нацыянальных меншасцях у кастрычніку 1934 г. [5, арк. 114]. 13 студзеня 1934 г. з польскага консульства ў Мінску была накіравана тэлеграма паслу Польшчы ў Маскве, у якой паведамлялася аб арыштах у БССР былых дзеячаў БСРГ, якія прыехалі сюды па абмене (справа Беларускага нацыянальнага цэнтра) [3, с. 333].

13–15 лютага 1934 г. адбыўся візіт польскага міністра замежных спраў Ю. Бэка ў Маскву. Практычнай мэтай яго было прадэманстраваць, што, нягледзячы на падпісанне польска-германскай дэкларацыі, савецка-польскія адносіны не пагоршыліся. У выніку было вырашана, што неабходна павысіць узровень дыпламатычнага прадстаўніцтва да рангу пасольстваў і працягнуць тэрмін дзеяння савецка-польскага пакта аб ненападзенні на 10 гадоў. Адпаведны пратакол быў падпісаны 5 мая 1934 г. Вынікі візіта Ю. Бэка ў Маскву схілілі і польскіх, і савецкіх дыпламатаў да спробы падвесці баланс і зрабіць прагноз на будучыню. М. М. Літвінаў зрабіў вывад, што далейшае збліжэнне з Польшчай, у аснове якога знаходзілася б супрацьдзеянне германскай палітыцы, немагчыма [4, с. 173].

У савецка-польскіх адносінах гэтага перыяду важнае значэнне набылі пытанні ўступлення СССР у Лігу Нацый і заключэння Усходняга пакта. У снежні 1933 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову аб разгортванні барацьбы за стварэнне сістэмы калектыўнай бяспекі ў Еўропе ў мэтах прадухілення пагрозы вайны і фашысцкай агрэсіі [6, с. 308]. Пры гэтым было прызнана магчымым уступленне СССР у Лігу Нацый і адначасовае падпісанне еўрапейскімі дзяржавамі рэгіянальнага дагавора аб абароне ад агрэсіі. Удзельнікамі рэгіянальнага Усходняга пакта павінны былі стаць СССР, Фінляндыя, Польшча, Чэхаславакія і Прыбалтыйскія дзяржавы. Перагаворы аб Усходнім пакце працягваліся да канца 1934 г. У той час адбываліся размовы М. М. Літвінава з Ю. Бэкам у Жэневе. Але 9 кастрычніка 1934 г. міністр замежных спраў Францыі Л. Барту, прыхільнік уступлення СССР у Лігу Нацый і заключэння Усходняга пакта, памёр, што абцяжарыла палітычнае становішча. Пераемнік Л. Барту П. Лаваль шукаў магчымасці непасрэднай дамовы з Германіяй, што паслабіла б значэнне праекта Усходняга пакта.

Польская палітычная эліта зыходзіла з таго, што для захавання кантролю над "усходнімі крэсамі" нельга дапускаць умацавання пазіцый СССР у Еўропе. У дакументах Міністэрства замежных спраў Польшчы снежня 1936 г. указвалася, што вайна магчымай кааліцыі з удзелам СССР супраць Германіі прывядзе не проста да падзення А. Гітлера, а можна выклікаць у Германіі камуністычную рэвалюцыю [6, с. 353]. У канцы 1930-х гадоў захавалася зацікаўленасць савецкага кіраўніцтва ў наладжванні супрацоўніцтва з Польшчай у сувязі з ростам агрэсіўнасці Германіі. У прыватнасці, гэту гатоўнасць павінна было пацвердзіць рашэнне Камінтэрна аб роспуску ў 1938 г. КПП і яе філіялаў КПЗБ і КПЗУ. Падчас сустрэчы з польскім паслом У. Гжыбоўскім 20 кастрычніка 1938 г. намеснік наркама замежных спраў СССР У. П. Пацёмкін, пералічваючы фактары, якія адмоўна ўплываюць на савецка-польскія адносіны, не ўзгадаў пытанні, звязаныя з Заходняй Беларуссю і правамі нацыянальных меншасцяў у Польшчы [7, с. 21].

Летам 1937 г. савецкі ўрад прапанаваў польскаму боку скараціць на тэрыторыі СССР колькасць польскіх консульстваў з мэтай ліквідацыі дыспрапорцыі паміж колькасцю польскіх консульстваў у СССР і савецкіх консульстваў у Польшчы. У адваротным выпадку ўрад СССР пагражаў дэнан-

саваць консульскую канвенцыю. У сярэдзіне 1938 г. пачаліся перагаворы аб гандлёвай дамове. Добразычлівая пазіцыя савецкага ўрада садзейнічала таму, што 19 лютага 1939 г. былі падпісаны "Дагавор і Дамова аб тавараабмене і разліках". Дэкрэтам Прэзідэнта Польшчы ад 11 сакавіка яны ўводзіліся ў дзеянне яшчэ да таго, як сейм разглядзеў праект закона аб іх ратыфікацыі. Паспяховасць гэта была абумоўлена развіццём міжнародных падзей.

Народны камісар замежных спраў СССР М. М. Літвінаў у размове з польскім паслом В. Гжыбоўскім 1 красавіка 1939 г. падняў пытанне аб магчымасці ўмацавання непасрэднага савецка-польскага супрацоўніцтва. Польскі бок даў негатыўны адказ аб яе ўдзеле ў шматбаковых дагаворах. 4 красавіка 1939 г. савецкі бок зноў паўтарыў свой запыт. Аднак польская пазіцыя не змянілася. У паведамленні ТАСС савецкае кіраўніцтва зноў нагадала аб жаданні распачаць супрацоўніцтва. Але Міністэрства замежных спраў Польшчы працягвала ўхіляцца ад больш цеснага супрацоўніцтва з СССР, зводзячы яго да бягучых адносін і дамаўляючыся аб павелічэнні гандлёвых абаротаў. У польскім знешнепалітычным ведамстве лічылі, што абаснаванасць такой пазіцыі пацвярджаецца палітыкай Вялікабрытаніі ў адносінах да СССР: нягледзячы на шматлікія савецкія прапановы, ідэя супрацоўніцтва з ім разглядалася ў Лондане вельмі неспрыяльна [7, с. 22].

З пачатку мая 1939 г. план уцягнення Польшчы ў антыгітлераўскую кааліцыю стаў больш рэальным. Дэнансацыя А. Гітлерам польска-германскай дэкларацыі ад 26 студзеня 1934 г. рабіла немагчымым польска-германскую дамову, накіраваную супраць СССР. У гэтых абставінах адбыўся неафіцыйны візіт У. П. Пацёмкіна, намесніка народнага камісара замежных спраў СССР, 10 мая ў Варшаву. У размове з польскім міністрам замежных спраў бакі не прыйшлі на пэўнай узгодненасці пазіцый. На заявы У. П. Пацёмкіна, што Польшча ў выпадку нападзення з захаду зможа разлічваць на добразычлівую пазіцыю Савецкага Саюза, які не адмовіць ёй у дапамозе, калі яго папросяць аб гэтым, Ю. Бэк, спасылаючыся на прынцыпы дагавора аб нейтралітэце, адказаў адмовай, лічучы іх генеральным напрамкам міжнародных адносін. Гэтыя ж пытанні паралельна абмяркоўваліся В. Гжыбоўскім і народным камісарам замежных спраў В. М. Молатавым. Вызначаючы пазіцыю Польшчы ў адносінах да СССР, В. Гжыбоўскі сфармуляваў яе наступным чынам: Польшча не жадае ў цяперашні момант звязваць сябе якімі-небудзь дамовамі з СССР і адмаўляецца ад якіх бы то ні было савецкіх гарантый [8, с. 393–394].

Пункт гледжання аб непатрэбнасці польска-савецкага ваеннага супрацоўніцтва вызначыў і пазіцыю, занятую Польшчай падчас размоў з прадстаўнікамі генеральных штабоў Францыі і Вялікабрытаніі, якія адбываліся ў другой палове мая 1939 г. Інструкцыі Э. Рыдз-Сміглы не прадугледжвалі ніякай дамовы з СССР у выпадку ўзнікнення пагрозы ці ўзброенага канфлікту. Польскі план вайны прадугледжваў абарончыя дзеянні ў выпадку германскага ўдару і ўтрыманне пазіцый да моманту контрнаступлення Францыі і Вялікабрытаніі. У ходзе польска-англійскіх перагавораў абмяркоўвалася

магчымасць атрымання рыштунку праз тэрыторыю СССР, але толькі ў плане тэхнічных магчымасцей перагрузкі на пагранічных станцыях. Такая пазіцыя Польшчы зыходзіла з пазіцыі заходніх краін, у асаблівасці Вялікабрытаніі, у адносінах да савецкай прапановы аб стварэнні сумеснага антыгітлераўскага фронту [9, с. 68].

Мюнхенская змова за кошт Чэхаславакіі, адхіленне савецкай ініцыятывы па стварэнні сістэмы калектыўнай бяспекі ўмацавалі ізаляцыю СССР і абвастрылі становішча ў Еўропе. Але ў гэтых умовах Вялікабрытанія, Францыя і Польшча працягвалі паўтараць былыя аргументы, якія прывялі да таго, што не былі рэалізаваны ні Усходні пакт, ні ваенная канвенцыя, што павінна была стаць дадаткам савецка-французскага дагавора 1935 г., ні рэформа Лігі Нацый. Гэтыя абставіны прымусілі савецкі ўрад прыняць меры па забеспячэнні бяспекі СССР перад тварам пагрозы вайны ў Еўропе. Гэта было падкрэслена ў дакладзе аб міжнародным становішчы і знешняй палітыцы СССР, які быў зроблены В. М. Молатавым за пасяджэнні III сесіі Вярхоўнага Савета СССР 31 мая 1939 г. Старшыня СНК заявіў, што інтарэсы СССР супадаюць з інтарэсамі міралюбівых краін і накіраваны на тое, каб стрымаць далейшае развіццё агрэсіі шляхам стварэння надзейнага і выніковага абарончага фронту міралюбівых дзяржаў. Адначасова ён падкрэсліў, што савецкая палітыка павінна клапаціцца аб тым, каб Савецкі Саюз не быў уцягнуты ініцыятарамі вайны ва ўзброены канфлікт насуперак сваім жыццёвым інтарэсам. Для рэалістычнай палітыкі СССР, разам з імкненнем стварыць блок дэмакратычных дзяржаў, з’явілася альтэрнатыва – захаванне як мага болей доўга нейтралітэту ў непазбежным узброеным сутыкненні дзяржаў капіталістычнага лагера [1, с. 84–85].

Эпілогам стала развіццё падзей у ліпені–жніўні 1939 г. Вядомыя англафранка-савецкія перагаворы пацвердзілі, што заходнія дзяржавы не схільныя заключыць з Савецкім Саюзам дагавор аб узаемнай дапамозе. Адмоўна адбіўся на ходзе перагавораў і стан савецка-польскіх адносін. У такіх умовах 23 жніўня 1939 г. савецкі ўрад вырашыў заключыць з Германіяй дагавор аб ненападзенні, што давала час для ўмацавання абароны краіны. Нападзенне фашысцкай Германіі на Польшчу 1 верасня 1939 г. стала пачаткам Другой сусветнай вайны. “Пакт чатырох”, падпісаны 15 ліпеня 1933 г., стымуляваў развіццё савецка-польскіх адносін, аб’яднаў намеры бакоў па падрыхтоўцы да “Усходняга Лакарна”, дазволіў вырашыць шматлікія спрэчныя моманты двухбаковых адносін, у прыватнасці, нармалізацыі існавання савецка-польскай мяжы і воднага суднаходства, культурнага збліжэння.

## ЛІТАРАТУРА

1. Знешняя палітыка Беларусі : зб. дак. і матэрыялаў / склад. У. М. Міхнюк, У. К. Ракашэвіч, Я. С. Фалей, А. В. Шарапа. – Мінск, 1999. – Т. 3: 1928–1941 гг. – 321 с.

2. Материалы “Особой папки” Политбюро ЦК РКП (б) – ВКП (б) по вопросу советско-польских отношений 1923–1944 гг. / Рос. акад. наук, Ин-т славяноведения и балканистики, Рос. центр хранения и изучения док. новейшей истории, Науч. центр общеславян. исслед. – М., 1997. – 144 с.

3. Беларусь у палітыцы суседніх і заходніх дзяржаў (1914–1991 гг.) : зб. дак і матэрыялаў : у 4 т. / склад. А. Ф. Вялікі [і інш.] : рэдкал.: С. М. Мартынаў [і інш.]. – Мінск : Юніпак, 2012. – Т. 2 : 19 сакавіка 1921 г. – 31 жніўня 1939 г. – 479 с.

4. Документы и материалы по истории советско-польских отношений / Ин-т славяноведения и балканистики АН СССР, Ин-т истории польско-советских отношений Польской АН ; отв. ред. И.А. Хренов, Т. Цесляк. – М. : Наука, 1969. – Т. 6: 1933–1938 гг. – 434 с.

5. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 242п. Воп. 1. Спр. 241.

6. История внешней политики СССР. 1917–1975. – М., 1976. – Т. 1: 1917–1945. – 543 с.

7. *Мезга, Н. Н.* Западная Беларусь в советско-польских отношениях: от Рижского договора до воссоединения с БССР / Н. Н. Мезга // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2019. – № 4.

8. СССР в борьбе за мир накануне Второй мировой войны (сент. 1938 – август 1939 гг.) : док. и материалы / М-во иностранных дел СССР. – М. : Политиздат, 1971. – 671 с.

9. *Лазько, Р. Р.* Перад патопам. Еўрапейская палітыка Польшчы. 1932–1939 гг. / Р. Р. Лазько. – Мінск : БДУ, 2000. – 354 с.